Дар`я Ліс

# Вясновы Джаз

Гародня 2008

www.kamunikat.org

Серыя «Гарадзенская бібліятэка»
выдаецца пад патранатам
Аляксандра Мілінкевіча,
лідэра Руху «За Свабоду»,
лаўрэата прэміі імя А. Сахарава
Еўрапейскага парламента
«За свабоду думкі»

Лагатып серыі і праект вокладкі: Алеся Раднова

Наклад 200 асобнікаў.

Надрукавана пры дапамозе сяброў ксэраграфічным спосабам.

www.kamunikat.org

© Дар`я Ліс, 2008

# Даша... Дар`я Ліс...
# Прыміце яе, як наша сэрца...

Міхал Клеафас Агінскі ў канцы 18 стагоддзя стварыў паланез ля-мінор «Развітанне з Радзімай», у якім з непамернай тугой і болем абняў Радзіму перад ад'ездам на чужыну. Увесь нацыянальны боль сабраў Агінскі ў музыку паланеза. А наймацней баліць сэрца. Таму сэрцам Беларусі, самым балючым штуршком у свядомасці беларусаў містычна стала вёска Залессе на Смаргоншчыне, родная вёска кампазітара-паўстанца.

У вёсцы Залессе ў бацькоў Тамары і Алега нарадзілася дзяўчынка Дар'я Ліс, якая піша прыгожыя версеты і апавяданні.

Калі апавядаць пра Дар'ю Ліс, то трэба разважаць пра Божую волю, – а інакш нічога нельга ні зразумець, ні растлумачыць.

Бог прыслаў Дар'ю Ліс, маленькі камячок вялікага болю, у тое месца Беларусі, дзе гучыць паланезам ля-мінор вялікае гулкае сэрца нашай прыгожай Радзімы, – каб абудзіць нашы пачуцці, каб разварушыць нашы душы, каб нашы сэрцы вылечыць ад чэрствага спакою... Дзяўчынка Дар'я Ліс – гэта лекі ад чэрствасці і абыякавасці. Гэта лекі Бога. А яе бацькі, яе сястра Аляксандра – выбраныя Богам, каб засведчыць перад людзьмі сілу духа і мужнасць.

Дар'я Ліс на калясцы скончыла факультэт філалогіі і культуры Менскага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка. Яна займаецца журналістыкай і літаратурай. Яна не любіць, каб яе шкадавалі. Яна ўвесь час змагаецца, каб вырвацца з лапаў хваробы, каб жыць поўным жыццём. Хвароба карэктуе яе жыццё, але не мае права яго знішчыць. «Хачу сама зарабляць сродкі на свае патрэбы, мару пра тое, каб паехаць у Парыж, выпіць кавы ў кавярні, у якой Хэмінгуэй піў каву. Я мару пра вандроўкі ў далёкія краіны...»

Невылечную хваробу Дар'я Ліс атрымала ад продкаў, але памяць роду не захавала той прапрабабулі, ад якой перайшла родавая хвароба да Дар'і. Бог нас любіць не таму, што мы важныя і шмат дасягнулі ў жыцці, а таму, што Ён нас стварыў у любові, выбраў нас, каб мы неслі гэтую любоў, як крыніцу жыцця.

«Ці ж вы не ведаеце, што цела вашае ёсць святыня Духа Святога, Які ў вас ёсць, і Якога маеце ад Бога, ды што вы ўжо не належыце самім сабе? Вы ж здабытыя за вялікую цану, дык хваліце Бога ў целе вашым!» *(Першы ліст Апостала Паўла да карынцьянаў, 6, 19-20* )

Апостал Павел па волі Езуса паклікаў Дар'ю Ліс, каб яна прыйшла ў наш блізкі свет, і яе вусны сказалі:

«Душа мая сумуе і прагне пад сэрца да Бога,
Сэрца маё і цела маё радасна Бога хваляць!»

Як жа я пазнаёмілася з Дарэяй Ліс? Магчыма, мой любімы пісьменнік Генры Наўвэн з нябёс дапамог мне знайсці Дар'ю, хоць сказаў мне пра яе наш гродзенскі хлопец.

Тры апошнія гады я прачытала некалькі кніг пісьменніка, тэолага і пратэстанцкага святара Генры Наўвэна /24.01.1932 – 21.09.1996/. Нарадзіўся і доўга працаваў у Галандыі. Аднойчы выехаў з душпастырскай місіяй у Таронта, у цэнтр непаўнаспраўных L'Arche – Daybreak, – і там застаўся. Звязаў сваё жыццё з цяжка хворымі людзьмі, якім дапамагаў як святар, як брат, як нянька. Знайшоў сярод іх сваю сям'ю, сваё натхненне і герояў сваіх кніг, знайшоў у іхніх добрых сэрцах утоенага Езуса. Гэта Езус сказаў яму: «Ідзі і пасяліся сярод убогіх, яны цябе вылечаць...»

Генры Наўвэн памёр раптоўна ад сардэчнага прыступу. Ляцеў самалётам з Таронта ў Пецярбург з групай кіношнікаў здымаць фільм па сваёй кнізе «Вяртанне блуднага сына», па дарозе зрабіў перасадку ў Галандыі, каб сустрэцца з бацькам і братам, там яго дагнала смерць. Памёр на сваёй Радзіме.

Якраз цяпер я дачытваю яго апошнюю кнігу – гэта дзённік апошняга году жыцця «Мой год шабасовы», – гэта быў год духоўнага адпачынку святара дзеля таго, каб набрацца глыбокай духоўнасці ў кантэмпляцыі з Богам і сябрамі. Я чытаю гэтую кнігу па-польску, ператлумачаную з ангельскай мовы.

Дар'я Ліс містычна належыць да такой «Аркі», дзе непаўнаспраўным у адной сям'і лягчэй жыць, – такія «Аркі» дзейнічаюць, у свеце іх створана шмат, але ў Беларусі пакуль што няма ніводнай. У супольнасці нашых непаўнаспраўных маюць удзел толькі блізкія людзі – у Дар'і, гэта бацька, маці, малодшая сястра і сваякі. Нашы хворыя людзі, асабліва непаўнаспраўныя дзеці і моладзь, цярпліва чакаюць нашага ўдзелу ў іх лёсах, нашай падтрымкі, як маральнай, так і фізічнай, сведчання нашай людскасці, дабрыні і міласэрнасці... Але не толькі хворым патрэбны здаровыя. Здаровым патрэбны

хворыя яшчэ болей, каб лячыць свае зачарсцвелыя душы. Калі да нас прыходзіць бяда, мы хочам прытуліцца да некага, хто нас зразумее. А зразумее нас той, хто сам зведаў бяду. Зразумее нас нехта добры, пры кім можна паплакаць, хто не спяшаецца ўцякаць ад нас, хто складае ахвяру Богу пакутай, цярпеннем, хто мае час думаць... Але нам нельга забываць пра тое, што гэты нехта добры – хворы і слабейшы за нас...

Я пачула голас Дар'і Ліс у начным эфіры радыё «Свабода», дзяўчына адказвала на пытанні журналіста і чытала свае версеты. Мне сказалі, што версеты Дар'і друкаваліся ў часопісе «Дзеяслоў», але я не маю гэтага нумару.

І вось прынеслі мне кнігу, укладзеную Дар'яй Ліс, каб я пачытала. Я прачытала ўважліва і версеты і апавяданні, невялікія, эмацыйныя, даволі завершаныя, дынамічныя, стылёва вытрыманыя, з сучаснымі юнацкімі  сюжэтамі. Творчасць Дар'і Ліс развіваецца ў агульным накірунку моцнай хвалі  беларускай маладой літаратуры.

Дар'я Ліс валодае добрай чыстай мовай. Героі яе апавяданняў маральна прыгожыя, духоўна багатыя, выхаваныя і адукаваныя. Шмат вандруюць. У творчасці Дар'я перажывае паўнату свайго жыцця, сваіх дзявочых мараў, перадае пасланне і прывітанне добрым людзям, каб даведаліся пра яе перажыванні, каб адклікнуліся на яе голас з Залесся...

Жартам я сказала, што ўсе героі п'юць зашмат горкай кавы, якая шкодзіць сэрцу. Мне прапанавалі паразмаўляць з аўтаркай па тэлефоне. Я набрала нумар. Зноў пачула той самы чысты, дзявочы, даверлівы і вясёлы голас, які ўжо чула па радыё. Пасля нашай размовы я паслала Дар'і некалькі  кніжак, яна атрымала іх і тут жа патэлефанавала, падзякавала.

І я ўжо ведаю, як Дар'я чакае выхаду сваёй першай дзявочай кнігі, а марыць пра добрую каляску... Вядома ж, я не спытала, ці танцуе Дар'я ў сне паланез ля-мінор, каб не параніць яе далікатную душу. Але калі Дар'я прапанавала назваць сваю кнігу «Вясновы джаз», то зразумела, што душа яе танцуе.

А яшчэ яна мне сказала, што гэта яе стрыечная сястра Вольга згадала інтуітыўна, дзе ў Залессі на пляцы Агінскага закапаны камень Жана Ралі... Гэтым паведамленнем Дар'я апярэдзіла маё пытанне, ці любіць яна сваю гістарычную вёску Залессе.

Ізноў вяртаюся да мудрых лістоў Апостала Паўла. Ліст да Філімона пісаў Апостал з рымскай няволі, у якой знаходзіўся паміж

61 і 63 гадамі. Заможнага каласаніна Філімона Павел навярнуў у хрысціянства раней, чым трапіў у няволю. Разам з Апосталам у турме сядзеў беглы нявольнік Філімона Анісім, якога Апостал навярнуў у турме да хрысціянства, якога і пасылаў разам з лістом да Філімона.

Апостал Павел ведае наперад, што адрасат прыме і ліст і слугу свайго Анісіма са зразуменнем, як хрысціянін хрысціяніна, – і даруе слузе яго ўцёкі, таму так спакойна разважае:

«Прашу цябе за майго сына Анісіма, якога нарадзіў я ў кайданах.../Маецца на ўвазе нараджэнне духоўнае, ці навяртанне да Хрыста/... Які калісьці быў табе не карысны, а цяпер і мне і табе карысны... Якога я табе вяртаю. Дык ты прымі яго, як маё сэрца... Калі маеш мяне за супольніка, прымі яго, як мяне. Калі ж ён у чым пакрыўдзіў цябе або што вінен, гэта на мяне залічы. Я, Павел, напісаў уласнаю рукою, што я сплачу табе, – каб пры тым не казаць табе, што і ты мне вінаваты сябе самога...» (Ліст Апостала Паўла да Філімона, 10-12, 17-19).

Шмат хто з нас вінаваты саміх сябе тым, хто нас выхаваў, паставіў на ногі ў пачатку жыцця ...

Дар'і Ліс мы вінаваты ўсёй супольнасцю нашае нацыянальнае ўзаеманавяртанне і яднанне ў адну еднасць, здольную забяспечыць цярпенне хворым і непаўнасправўным. Яны маюць права на звычайную штодзённую радасць, на прыемнасць займацца простымі справамі, карыстацца простымі рэчамі, на шчырасць і сяброўскасць, на дабрыню душаў і сэрцаў.

У невялікім эсэ пра Дар'ю Ліс я шмат прыводжу прыкладаў з Евангелле, паколькі Евангелісты і Апосталы мелі непасрэднае дачыненне да людскіх цярпенняў, да метадаў стварэння хрысціянскіх узаемаадносін у вялікіх супольнасцях сусветнай сям'і, якую яны пачыналі будаваць па праекту Езуса Хрыста. Іх словы мне здаюцца больш пераканаўчымі, чым мае. Таму я асмелюся прывесці ўрыўкі з адной старажытнай песні, яна называецца «Малітва Азарыя ў вогненнай печы» і мае эпіграф: «Дык пакутуйце і навяртайцеся, каб грахі вашыя былі скасаваныя».../Дзеі Апосталаў, 3,19/. Мне здаецца, што гэтая старажытная песня створана пра нашу супольнасць.

«Божа, Ты справядлівы ва ўсім, што ўчыніў з намі, усе Твае справы праўдзівыя, Твае дарогі простыя, а Твае прысуды правільныя. Дзеля Твайго святога Імя не адбірай свайго Запавету.

Не пакідай нас назаўсёды і Твайго святога Ізраіля... /Маецца на ўвазе – Залессе.../

Ты ж абяцаў размножыць яго патомства, як зоры на небе, як пясок на дне мора... Ці паўстануць цені, каб Цябе праслаўляць?...

Божа, вось мы найменшыя з усіх народаў... Сёння мы найболей прыніжаныя на ўсёй зямлі з прычыны нашых грахоў... Не маем ані ўладцы, ані прарока, ані настаўніка... ані цэласпалення, ані ахвяраў, ані добрай ежы, ані кадзення, – і нават няма дзе скласці Табе дары з першых плёнаў... і адчуць міласэрнасць Тваю...

Няхай душы збянтэжаныя і Дух уніжаны знойдуць у Табе ўпадабанне...

Нібы цэласпаленне з вялікіх статкаў авечак і цялят, – няхай наша ахвяра будзе прынята Табой і спадабаецца Табе... Бо тыя, хто Табе даверыўся, не будуць мець сораму.

Пойдзем за Табой, шукаючы аблічча Тваё. Не адбірай у нас сваю міласэрнасць, Госпадзе...»

Гэты ўрывак я перадала спрошчанай мовай.

Усе цытаты з Евангелля я брала з кнігі Уладзіслава Чарняўскага, нашага першага свядомага душпастыра Беларусі, які вытрымаў дзеля нас усе выпрабаванні лёсу, служачы Богу ў Вішняве, якое не так далёка ад Залесся, куды Бог, нахіліўшы свае нябёсы, працягнуў з вышыні свае рукі і паклаў на рукі выбраных бацькі Алега і маці Тамары дзяўчынку Дар'ю, каб яе пакутамі вызваліць нас з рук чужаземцаў, чые вусны ілгуць... каб яе вуснамі заспяваць новую песню вызвалення...

*Данута Бічэль*

www.kamunikat.org



# Крыху пра сябе...

Нарадзілася 6 кастрычніка 1981 г. у вёсцы Залессе, скончыла Залескую сярэднюю школу, потым – факультэт беларускай філалогіі і культуры БДПУ імя М. Танка. Сталы супрацоўнік «Новой газеты Сморгони» да яе закрыцця, у дадзены момант пішу для выдання «СН. Свободные новости плюс»». Інвалід-калясачнік – такі «бар'ерчык» па жыцці, які трэба пераадольваць (у кожнага чалавека на гэтай планеце – свае перашкоды...). Люблю жыццё і сваіх блізкіх, залатую восень, харошыя кнігі, беларускі рок... Вабяць далягляды і няспраўджаныя (пакуль) падарожжы. Мары: 1. пабачыць Парыж (і жыць далей ☺) ды папіць кавы ў кавярнях, дзе бываў Хемінгуэй, пахадзіць вулачкамі Вільні, пабачыць Балтыку; 2. праца, што дапаможа ажыццявіць п. 1 і быць фінансава незалежнай☺ – у першую чаргу ад сваіх фізічных абмежаванняў☺

*Ліс Дар'я*

dasha_lis@tut.by,

dalis4@yandex.ru

# Вершы

www.kamunikat.org

Беларусь – краіна незвычайная.
Незвычайна прыгожая.
Незвычайна цікавая.
Незвычайна таямнічая.
Незвычайна таленавітая.
Фармальна незалежная,
Але не свабодная.
Надзвычай раўнадушная краіна.
Да жалю...
Дзе наш вецер змен?

*2002 г.*

www.kamunikat.org

Краіна-загадка
ў цэнтры Еўропы.
Адказ на пытаньне –
квадрат Малевіча.
А  зорка Палын
асьвеціць сустрэчу
І дождж,
І шэрых людзей,
І вечнасць.

www.kamunikat.org

І зоры, і вечар –
Ўсё гэта вечна.
Розныя людзі –
Розныя стрэчы.
Чакаць недарэчы,
Што вернецца?
Вецер…
А сонца асвеціць
Пяшчоту рукі

www.kamunikat.org

Апала лістота,
Шлях ідзе да зімы…
Каханне? Потым…
Ніяк не сустрэнемся мы.

Ты праходзіш.
Не бачыш
Маіх
Вачэй.
Я не змагу прабачыць
Бездань самотных начэй.

Я не змагу – першая.
Я жанчына… ўсё ж.
Каханне (крэда!) – вершамі.
За вокнамі зорная ноч.

*Лістапад, 2006*

www.kamunikat.org

Я балансую на мяжы
Сяброўства і кахання.
Задумы,
Мары,
Міражы – выратаванне.

Халодны, шэры
Дождж імжыць -
Дзей і падзей
Наканаванне –
Да болю родны і… чужы.
Напаўлегальныя спатканні.

*Снежань-2006*

www.kamunikat.org

## Кампрамат

*Вераніцы Чаркасавай*

Кроў на паперы,
На клёнах – таксама.
Кастрычнічнік.Цемра.
Мне страшна, мама…
Чырвоным па белым --
Зьнікае цела.
А людзі ў шэрым.
А людзі – шэрыя...
Чырвоным па белым -
Сэрцам і верай.
Мой верш – кампрамат.
На шматкі – паперу!

www.kamunikat.org

Восень.
Верасень
Сінім невадам
Кветкі верасу
Цягне з вераду
Дзён разьясьненых
І асьветленых,
Сумнай згадкаю,
Белым ветразем...

www.kamunikat.org

Сустрэцца аднойчы -
Вочы ў вочы…
І жнівеньскі вечар
Спрыяе сустрэчы,
Але -- недарэчы...
Старэнькі заплечнік
Пярэчыць.
Такім
Настальгічным
Рэчам.

www.kamunikat.org

## Ты прабач

Не апошні, ня першы
Пройдзеш – не зразумееш,
Мне ж застануцца вершы:
Бо пажнеш – што пасееш.

Быць адною – нялёгка.
Вечным станецца вечар:
Выбачай, мой далёкі,
Я іду да сустрэчы.

Ты крычы – не маўчы,
А інакш не паверу
І рукам, і вачам,
І начному даверу...

Верас – сонцам між сосен.
Хвалі гойдае вецер.
Ты прабач, мой харошы:
За нясьпетую песьню…

www.kamunikat.org

## Не сустрэцца...

Адзінота -
мая незалежнасьць?
Не пазбегнуць самоты.
Ні табе, ні сабе
Не належыць.
Неістотнасьць.
Нявечнасьць.
Вочы ў вочы
Ніколі з табой -
Не сустрэцца...

www.kamunikat.org

Ты палі…
І налі,
Калі ласка,
Кавы.

Гэты дзень -
Суму цень,
Як і ты,
Неласкавы.

Не шкадуй! Запалі
Наш ліхтарык надзеі.
Неўзабаве зіма –
Я згублюся ў завеі...

www.kamunikat.org

Адліга пасярод зімы –
Вясна ў студзені.
Сосны маўчаць…
Пра што?
Каб ведаць...

www.kamunikat.org

## Каляды

Калядны вечар,
Палае сьвечка
На вакне –
Як знак падарожнаму:
Сьвяты вечар,
Сьвята сустрэчы,
Сьвята сьвятла.

www.kamunikat.org

Краіна манкуртаў –
Не разам, а гуртам.
Асоба губляе сябе.

У шэрым, як восень,
Халодным натоўпе
Праглянулі катаў
Пустыя вочы:
Шукаюць цябе.

Пустадомкі ва ўладзе -
Беларусь у журбе.
Што ўратуе цябе?
Кава, ноч, цыгарэты?

Беларусь у журбе –
Нас шукаюць каты…
Ёсць дарога на Захад,
А ёсць шлях да сябе.

Гэта не важна, позна ці рана.
Важна, з кім ідзеш.
*«Прастора», NRM*

Мы па-за законам
У сваёй краіне,
Мы быццам чужынцы
У краіне сваёй.

І кроў у жылах стыне:
Крывіцкі Край згіне.
Мы будзем чужынцы
У чужой старане.

Зноў шэрыя вуліцы
Шэрай краіны
Захопяць нас холадам,
Жахам, імжой.

Блакітныя вочы маёй краіны
Захопяць хіжыя зрэнкі жуды,
Якая ідзе, як заўжды, з Усходу,
Якую і мы спыніць не змаглі.

www.kamunikat.org

Знікаюць людзі –
Раскашуюць каты.
Ні слова, ні знаку
Не засталося,
А Край балот
Хавае зацята
І таямніцы,
І сваіх сыноў -
Чамусьці лепшых.
Знікаюць людзі.
Застануцца каты?

www.kamunikat.org

Падалі хмарачосы –
Цяпер ідзе снег.
Не шанцуе Беларусі
З палітычным
Надвор'ем.

www.kamunikat.org

У радасці, журбе -
Мы самі па сабе
І кожны за сябе:
І хата мая з краю.
Салідарнасць?
Правакацыя.
Карыкатура.
Маёй.
Нацыі.

*Сакавік, 2006*

www.kamunikat.org

Менск падобны на Лондан –
Шэры смог, шэры дзень…
Наш студзень – бы лістапад…
І неба… згубіла колер.
Ты маеш рацыю –
Ніякага адчаю! –
Гэты горад (яму горай!)
Не стаў маім.
Насамрэч.

www.kamunikat.org

Мая восень
Са мной.
Зімовыя сосны.

www.kamunikat.org

Кастрычнік.
Зноўку
Першы крок.

www.kamunikat.org

Я не шкадую
Ні аб чым
Я ведаю
Ўсё вернецца:
І красавік,
І вершы,
І песні.

*2007 г.*

www.kamunikat.org

Між намі – цунамі,
Палыном – небакрай.
За спінаю
Чорныя крылы
Расправіў
Магутна адчай…

Між намі?..
Снягамі
Сустрэла  зіма.
Каляды…
Я рада, сказаўшы
(З палёгкай?)
«Бывай!»

*Студзень, 2007*

www.kamunikat.org

На Беларусі восень,
Кастрычнік.
Паветра марскога і ёду
Не хапае катастрафічна.
Апошні шанец –
Пазбыцца кратаў...
Адкуль пакора?!
Нямым паўторам:
Год  37-ы.
2007 глядзіць з дакорам.
Спыніце ката,
Бо прыйдзе статак
Ізноў з Усходу...
І будзе позна:
І ўжо ня спыняць
Арду балоты.

www.kamunikat.org

## ПАЗЛ

*Маме…*

Збіраю па частках
Сваю незалежнасць
І веру, што пазл
Супадзе
Непазбежна.

Я веру
Святлу і веры.
Каханню
Не на паперы,
Ні ў Сеціве:
У супярэчным -
Тут і цяпер – свеце.

У кожнага – свая мяжа
Ды мера,
Чорныя дзіркі,
Агеньчыкі ў змроку –
Я веру.
Ты ведаеш…

*07.01.07.*

www.kamunikat.org

# Апавяданні

www.kamunikat.org

# Пад Новы год...

Ішоў снег, варылася кава, а ён патэлефанаваў і сказаў, што... Не прыйдзе. Не прый-дзе. Справы...

І ўсё было б нармальна, усё можна перажыць на планеце Зямля... Але! Праз гадзіну Новы год! І гэты Новы год яны абавязкова павінны былі сустрэць разам. Абавязкова разам. Ленка заўжды лічыла Новы год святам сямейным, спакойным і ўтульным...І заўжды ехала дадому, да бацькоў. Цяпер жа засталася ў Менску толькі дзеля Ягора... Калі яна і не спадзявалася ўжо, што ў іх адносінах нешта зменіцца да лепшага, ён патэлефанаваў і сказаў: «Малыш, давай сустракаць разам Новы год?». Ну, зразумела! Давай будзем разам на маё любімае свята! Давай вырашаць, што далей будзе з намі і з нашымі адносінамі! Я нават не паеду да мамы і не пайду да сяброў! «Цяпер і не паспею», – падумала яна, і пайшла на кухню піць каву. Чорную-чорную – такую ж, як яе настрой, яе думкі. Узнікла моцнае жаданне расплакацца ад крыўды, злосці, ад свайго чарговага няўдалага раману. У шафе новае сукенка! За акном – снег і ўвесь горад у мігатліва-вясёлых агеньчыках, у прадчуванні чагосьці новага, казачна-загадкавага... «Увесь Менск, толькі не я...», – падумала Лена, і слёзы закапалі раптоўна... Не, усё ж зусім не раптоўна.

Зазваніў мабільны. Пачуўся знаёмы голас... Так, дзякуй! І цябе са святам. Як справы? Нядрэнна, калі не лічыць таго, што яшчэ не ведаю дзе і з кім сустрэну Новы год... А ты? Адзін сустракаеш...Чаму?! Работа... Ды якая, да трасцы, сёння праца?! Адны працаголікі паўсюль... І ты распачаў свой бізнэс?

– Ды не, Лен, я падпрацоўваю ахоўнікам (ты ж ведаеш, на аспіранцкую стыпендыю не пражывеш!), падмяніцца не атрымалася – свята! – таму выбіраць не прыйшлося. Слухай, прыязджай да мяне!.. Ты паспееш, вазьмі таксоўку. І захапі цёплы свэтар! Цікавую «праграму» прапанаваць не магу, але хоць нагаворымся, як у старыя добрыя часы! Мы ж тысячу гадоў не бачыліся.

– Сапраўды, тысячу год...

Яна ўжо выцягвала джынсы і свэтар з шафы (сукенку ўсё ж прыйдзецца адкласці да лепшых часоў...).

– Дзім, ты набыў шампанскае? Не істотна, я вазьму яшчэ бутэльку!...

Кава паціху астывала на стале, а дзяўчына з прыгожай прычоскай (апранута яна была чамусьці па-спартыўнаму…) спяшалася на другі канец горада. Сустракаць Новы год са старым сябрам. Сапраўды новы.

Праз некалькі месяцаў Дзіма і Лена згулялі прыгожае вяселле… Але ў іх не атрымалася папіць разам шампанскага і спакойна сустрэць наступны Новы год. Маленькая Каця вырашыла – час! Інакш Дзед Мароз не паспее пакласці падарунак пад елку новаму чалавечку.

*2003*

www.kamunikat.org

# Звычайная гісторыя

Была сярэдзіна верасня, надвор'е стаяла цудоўнае (сонечна і суха), але адчувалася – прыйшла восень. Яна з'явілася, гэта золатавалосая прыгажуня, пачала афарбоўваць дрэвы ў жоўта-чырвоны колер, прывяла за сабой непаўторныя гукі і пахі, а таксама – настрой . Такі настрой – сумна-тужліва-светлы – бывае толькі восенню...

Марына вярталася з працы дадому, усміхаючыся сваім думкам, небу, сонцу, усяму свету, бо адчувала сябе шчаслівай, маладой, прыгожай... Стройная постаць, кароткая стрыжка, якая толькі падкрэслівала прыгожыя валасы попельнага колеру, іскрыстыя сінія вочы – сапраўды, не ведаючы яе, нельга было сказаць, што ёй трыццаць тры, а не якіх-небудзь дваццаць пяць-дваццаць сем год. Магчыма таму, што яна займалася любімай справай, кахала і была каханай. Магчыма таму, што ў яе быў Алежка – сын, самы цудоўны чалавечак на свеце, з якім яны ўжо перачыталі безліч казак і гісторый, а цяпер малы пайшоў у школку і сам з цікавасцю вывучае літары, складае з іх словы .

Марына была рада, што добра прайшоў гэты дзень: хораша папрацавала, шмат рэчаў паспела зрабіць, была задаволена сабой і сваімі студэнтамі, а здаралася такое не вельмі часта – яна была строгім выкладчыкам. Любіла свой прадмет і лічыла, што без ведання замежных моў у наш час вельмі складана дасягнуць поспеху ў жыцці, імкнулася давесці гэта сваім «падначаленым». «Напэўна, сёння я заслугоўваю хвілін трыццаць адпачынку і кубак добрай кавы». Яна вырашыла ненадоўга зайсці ў сваю любімую кавярню, а папярэдне зазірнула ў шапік і набыла пару свежых газет і часопісаў. У кавярні было ўтульна, гучала павольная музыка. Народу, як заўжды, даволі шмат, але «яе» столік свабодны (стаіць убаку ад іншых, напаўзакрыты нейкай дзіўнай пальмачкай – седзячы тут можна назіраць за наведвальнікамі кавярні, а самой заставацца незаўважнай). Марына зручна ўсталявалася і замовіла адзін моцны эспрэса. Сядзела, піла каву, чытала, планавала, што будзе гатаваць сваім мужчынам на вячэру ... «Трэба кудысьці выбрацца разам на гэтыя выходныя. Мы з Алесем шмат працуем, вольнага часу заўсёды мала і Алег часцей бывае ў бабулі з дзядулем, чым дома. У прынцыпе, ён не супраць, мама з татам таксама, але... Трэба часцей бываць разам!».

За суседні столік селі двое – жанчына і мужчына. Праўда, напачатку чуваць быў толькі жаночы голас. Неяк дзіўна... Яна казала, што так нельга, што трэба здымаць нармальную кватэру, дзе яны маглі б жыць разам, што такое становішча яе не задавальняе і, наогул, трэба нешта вырашаць ... Ён маўчаў, а калі загаварыў, Марына пазнала голас ... свайго мужа, свайго Алеся :

– Ты зразумей, я не магу вось так усё рэзка змяніць, кінуць жонку і сына! У Алежкі, дарэчы, хутка дзень нараджэння...

– А пра мяне ты хоць крыху падумаў ?! Я ж цябе таксама кахаю, у мяне таксама ёсць пачуцці! І мне надакучыла такое бязладнае жыццё!

– Сустрэнемся пасля дваццатага і ўсё вырашым, добра? Я ж таксама цябе кахаю. – І міжволі падумаў: «А мая жонка цудоўная жанчына і мой лепшы сябра...Як з гэтым фактам, Алесь?»- У нас усё будзе добра!.. Толькі цяпер мне бегчы трэба. Пакуль!

Ён пайшоў. Марына сядзела побач з гэтай жанчынай. Яна не ведала, што рабіць далей. За некалькі хвілін з-за выпадкова пачутай размовы яе жыццё, яе ўяўленне пра сваё жыццё, кардынальна змянілася. Змянілася яна сама. Вочы былі сухія, ніякіх слёз, але ў душы пасялілася крыўда і непаразуменне, яна адчувала сябе падманутай: «Што ж мне рабіць цяпер? Вярнуцца дадому і гатаваць вячэру так, быццам нічога не змянілася ? Усміхацца, быць вясёлай (Ён жа пакуль з табой, застаўся шанец утрымаць мужа, другая была б, магчыма, рада. Толькі не я)? Ці мо ўчыніць скандал? Гэта не мой стыль, не мой... «.

Марына дапіла каву і выйшла з кавярні, міжволі зірнуўшы на суперніцу: «Прыгожая ... Але – зусім дзяўчынка ... Адна з яго студэнтак?».

На вуліцы церусіў дробна-шэры дождж, надворе рэзка змянілася: восень – паненка капрызная, пераменлівая. Вецер зрываў лісце з дрэў і кружыў яго ў паветры. Жанчына ішла па вуліцах, не вымаючы парасон, не зважаючы на дождж і думала пра сваё. Непрыкметна апынулася ля чыгуначнага вакзала. «Можа, гэта лёс?». Падышла да касы, дастала грошы. Білет да Сімферопаля? Ну, зразумела, ёсць. Вам на які дзень? На сёння? Ёсць апошні (а то, ведаеце, – аксамітны сезон, вам пашанцавала, дзяўчына) цягнік, ідзе ў дзевяць гадзін вечара. Окей, тое, што трэба! А далей? Тэлефанаванне матулі.. Мам, я з'язджаю на тыдзень, тэрміновая камандзіроўка (ты ж ведаеш, твая няўрымслівая дачка яшчэ журналістыкай занялася), нічога не кажы, прашу толькі паглядзець Алежку, дзякуй,

я цябе вельмі люблю. Тэлефанаванне ва ўніверсітэт. Я захварэла, мяне не будзе прыкладна тыдзень. Студэнты, семінар? Без мяне, калі ласка! Могуць быць праблемы? Яны ў мяне ўжо ёсць: адной менш – адной больш. Да пабачэння! Адключыць сотавы. Маіх яшчэ няма. Добра, так лягчэй. Хутка сабраць рэчы. Грошы. Трасца з ім, шыкоўным футрам, першы раз у жыцці я адважылася на такую авантуру... Хутчэй з дому, інакш перадумаю!..

Марына выйшла на вуліцу, узяла таксі і паехала на вакзал. Час яшчэ ёсць. Толькі цяпер яна адчула, што вельмі галодная: за ўвесь дзень – канапка ды два кубкі кавы. Яна зайшла ў даволі ўтульны рэстаранчык на вакзале, прысела за столік, замовіла піцу, слухала нейкую музыку, думаючы ні аб чым і аб усім адначасова... І так – да паловы на дзевятую, а потым быў цягнік і дарога, дарога, дарога... Ні пра што не думаць. Ехаць бы і ехаць вось так! Бачыць новыя краявіды, адчуваць сябе свабоднай і незалежнай ад ўсяго, ад усіх! Яна прыціснулася гарачым ілбом да халоднага аконнага шкла, заплюшчыла вочы, з якіх цяпер чамусьці цяклі слёзы...

Марына з дзяцінства любіла мора, Крым, імкнулася бываць тут часцей. Яе ж імя азначае «марская»... Калі было дрэнна і нешта ў жыцці не ладзілася (і калі было добра – таксама!), заўсёды цягнула паехаць да мора, адчуць яго пах, смак солі на вуснах і падставіць твар марскому ветру, але толькі цяпер адважылася на такое...Апошні раз адпачывалі з сям'ёй ў Балгарыі, а ў Крыме яна не была тысячу год...

Невялікі гарадок Феадосія прыняў як старую добрую знаёмую – добрай усмешкай сонца (яно прыемна сагравала, але не пякло так, як летам), водарам кветак, марскіх водарасцей і солі... Марына зняла пакой у доме непадалёк ад пляжа. Наперадзе – тыдзень мора, сонца, адпачынку... Не , не зусім адпачынку, хутчэй – часу для таго, каб разабрацца ў сабе , сваіх думках і пачуццях, у сваім жыцці наогул. «Як даўно я не была адна, сам насам з сабой! Амаль заўжды, дома і на рабоце, са мной людзі (ці кнігі) – блізкія, далёкія... Я люблю зносіны, я таварыскі чалавек, але як важна: калі-нікалі належаць толькі сабе, рабіць тое, што хочаш. Так, канікулы патрэбны ўсім!» Марына думала пра гэта, раскладаючы свае рэчы. Дзіўна, але пасля доўгай дарогі зусім не адчувалася стомленасці...

Пляж сустрэў спакойным вечаровым сонцам – яно адбівалася на вадзе, ад чаго тая здавалася іскрыста-блакітнай, хвалі мякка падтрымалі цела, абдалі свежасцю, і кінуўшы на пясок лёгкую сукенку ды саламяны капялюш, жанчына зайшла ў ваду і паплы-

ла, імкнучыся ні аб чым не думаць, ні пра што не ўспамінаць. Мора і сонца, ветрык і хвалі, я і гэты горад, гэты вечар. Пра ўсё астатняе, пра Алеся, я падумаю потым, заўтра ці крыху пазней. А што сёння? Зайсці ў якую-небудзь кафэшку (каб слухаць музыку і гукі мора адначасова), замовіць кавы і віна і... Чаго я яшчэ хачу? Танчыць. Так, і больш нічога , здаецца , не трэба. Не думаць – не думаць – не ўспамінаць.

Невялікі бар з дзесяткам столікаў амаль на самым марскім беразе. Людзей зусім не шмат (усё ж – восень). Знаёмая мелодыя (Мэрайя Кэры?) і некалькі параў, што танчаць пад шчымліва-рамантычную мелодыю. Маша выбрала вольны столік Музыка, віно, персікі і кава.

– Можна запрасіць вас? – плынь думак – адчуванняў перапыніў мужчына гадоў 37. Чорныя джынсы, спартовая майка – тыповы адпачываючы... Яго несаўковасць падкрэслівалі хіба чорныя густыя валасы па плечы ды праніклівы пагляд шэрых вачэй.

– Можна. Толькі я не ўпэўнена, што сёння з мяне атрымаецца добрая партнёрша.

– Давайце ўсё ж паспрабуем. Я ледзь не гадзіну назіраю за вамі, і мне здаецца, вам трэба падумаць пра штосьці несур'ёзнае цяпер. Такая прыгожая жанчына і такая сумная!

– Так заўважна? «Божа, мне так даўно не гаварылі банальных кампліментаў... Прыгожая жанчына...».

– Ведаеце, у мяне таксама хапае праблем, але, паверце мне, большасць з іх вырашальныя. І ў вас усё будзе добра. А сёння... давайце проста танцаваць, згодны?

–Згодна!

Гучаў саксафон, было цудоўнае чырвонае віно, і яны танцавалі гэтай ноччу пад святлом яркіх паўднёвых зорак. Нічога не кажучы адзін аднаму. Проста музыка, мора і два чалавекі з розных сусветаў, якія выпадкова сустрэліся. Развіталіся праз некалькі гадзін.

Заўтра вечарам на сваім любімым закінутым пляжы Марына ўбачыла мастака.Села непадалёк і проста назірала за ім са спіны, за прыгожымі рухамі моцных рук, за прыгожым захадам сонца, якое надавала марскім хвалям залацістае адценне – блакіт вады і неба змешваўся з бронзай пясчанага пляжа. Марыне хацелася бясконца сядзець тут, абхапіўшы калені рукамі (здаецца, яшчэ крыху – і паляціш!), глядзець на неба, адчуваць прысмак солі на вуснах...

– Можна намаляваць ваш партрэт?

– Вы?!

– Канечне, я, а ты здзіўлена, што мы сустрэліся?

– Крыху, але гэта прыемны сюрпрыз. Ты мой першы знаёмы ў горадзе. Гэтай восенню…

– Як наконт партрэта?!

– Чаму не?! Я згодна, толькі ў цябе мала часу.

– Я ведаю… Колькі ты яшчэ будзеш тут?

– Пяць дзён.

– Паспеем.

І яны сапраўды паспелі шмат. Стварыць партрэт. Патанчыць. Папіць добрага віна. Надыхацца морам і сонцам. Пазнаёміцца. Пасябраваць. Пакахаць. Быць разам. Пяць дзён. Маленькае жыццё, дзе былі толькі двое – сам насам з марскімі хвалямі, пяском, зоркамі…

– Ведаеш, усё жыццё я займаўся не тым, чым хацеў… Шмат працаваў, займаўся бізнесам. Але я разумеў – не маё, я павінен маляваць, я хачу стаць мастаком, хоць інстытут кінуў на другім курсе… Такая вось мара, што адкладалася, адкладалася, а потым здарылася адна падзея, і я зразумеў – цяпер ці ніколі, я павінен паспець зрабіць нешта «сваё»!.. І прыехаў сюды, і ўбачыў цябе. Я не мог не прыехаць у горад свайго дзяцінства! І сустрэў цябе.

– Якая падзея здарылася?

– Потым.

– Добра… А я вось апошнім часам захапілася журналістыкай: пішу артыкулы для аднаго беларускага штотыднёвіка, але асноўная праца – выкладчык французскай. Ведаеш, мне прапанавалі сталую працу журналіста, праца цікавая, творчая, толькі вельмі актыўная, з раз'ездамі і камандзіроўкамі, а ў мяне маленькі сын і муж («Які цябе кідае» – дадала пра сябе).

– Ты адмовілася?

– Не, я сказала, што падумаю… Калі шчыра, ты першы, каму я сказала пра гэту прапанову.

– Згаджайся, калі – «тваё». Ты нікому не зробіш лепш, калі адмовішся ад сваёй мары. Проста на планеце Зямля на аднаго шчаслівага чалавека стане менш.

– Я шчаслівая! У мяне цудоўная сям'я, сябры і праца даволі цікавая…

– Але...

– Але мне трэба ісці наперад, каб быць сабой. Цяпер я разумею. Я хачу пісаць цікавыя артыкулы пра цікавых людзей, я хачу напісаць кнігу. Я хачу пісаць кнігу на беразе мора, у невялікім дамку, дзе заўсёды чуцен шум марскога прыбою...

– Ты малайчынка, Маш. Ты справішся.

– Дзіма, я цябе яшчэ убачу?

– Зразумела! Я прывязу твой партрэт у Менск, а ты прыедзеш ва Уладзівасток. І ўбачыш, які там прыгожы акіян, толькі халодны...

Быў вечар, была ноч, а раніцай адыходзіў яе цягнік, і ,стоячы ля акна, яна глядзела ў сінія вочы, разумеючы, што больш іх не ўбачыць ніколі. Ні-ко-лі. І яна усміхнулася ім весела-сумна – на развітанне. Дзякуй, што ты быў.

Беларусь сустрэла шэрым небам і халодным дажджом. Жоўтым лісцем. Ветрам. Пахам зямлі і травы. Грыбоў. Лесу. Водар восені!..

На вакзале яе сустракаў Алесь. (Тэлефанаванне маме пасля пераезду мяжы). Падхапіў валізкі, спытаў іранічна, як заўжды, калі хваляваўся.

– Я магу запытаць, дзе мая жонка была цэлы тыдзень?! Што здарылася?

– Можаш. І пачуеш такую цікавую гісторыю... Але – не сёння, і не заўтра. Магчыма. Калі-небудзь. Раскажу шчыра і па-сяброўску. Сваю гісторыю. А ты сваю. Згодзен ?

– Ты мяне здзіўляеш, Маш.

– Здзіўлю яшчэ больш! Але ты здзівіў мяне першы.

– Хопіць размаўляць загадкамі!

– Бывай, Алесь. Пакуль здыму кватэру, пажыву ў сваіх. І... давай застанемся сябрамі, окей? Гэта табе! – і працягнула аранжава – чырвоны крымскі персік...

Забрала сумкі і пайшла да стаянкі таксі... Стаяў і глядзеў услед, не ведаючы, злавацца на яе ці усміхнуцца такім варункам лёсу.

Марына патэлефанавала рэдактару і сказала, што перойдзе да іх на працу. «Дадому! Так хочацца пабачыць хутчэй Алежку!».

Праз месяц ёй патэлефанаваў незнаёмы мужчына і папрасіў аб сустрэчы, сказаў, што ён ад Дзімы. Дамовіліся сутрэцца ў кавярні непадалёк ад рэдакцыі самай незалежнай газеты ў Беларусі... Сустрэліся, замовілі каву.

– Маша, я прыехаў у Мінск адмыслова для сустрэчы з вамі. Гэта Дзімава просьба перадаць вам партрэт. Яго не стала тыдзень таму. Рак. Апошняя стадыя. Некалькі месяцаў ён не мог абыходзіцца без абязбольваючых, за выключэннем тых дзён, калі вы былі разам. Ён ведаў, што яго чакае. І не хацеў, каб ведалі вы.

На фоне марскіх хваляў, на пяску, абхапіўшы калені рукамі, сядзела жанчына з іскрынкамі ў вачах, яе попельныя валасы лашчыў вецер... Унізе быў подпіс – «Дзякуй, што ты была».

За акном ішоў дождж.

*P.S.* Праз год выйшаў раман маладой пісьменніцы Марыны Каліноўскай. Кніга пра ўсходы, захады, каханне, сяброўства... Марскі вецер у твар, смак солі на вуснах. Магчыма, яна стане беларускім бестселерам еўрапейскага маштабу. У жыцці наогул магчыма ЎСЁ. Проста – ідзі.

*2003/2004*

www.kamunikat.org

# Лістота напрыканцы лістапада ападае павольна…

Аліса не збіралася ісці на гэта вяселле… Так ужо атрымалася – крыху нелагічна і сумна. Зразумела, трэба падтрымліваць зносіны з родзічамі – сямейныя традыцыі, святочныя сустрэчы і ўсё такое іншае… Аліска не любіла вяселлі. Стрыечная сястра ўсё ж падгаварыла пайсці, а бацькі сказалі – ну што ж ты, Лісяня, – НЯЁМКА…

Замуж. Замужам… За мужам! Свой, утульны і вялікі, дом, дзеці, моцныя плечы… Моцныя? Ромкавы плечы, ў прыватнасці, не вытрымалі такога цяжару. На жаль… І вось што цікава: ён літаральна насіў яе на руках (і кветкі таксама былі, і вершы, і проза – ёй), калі гэта было прыемн, але… не абавязкова, а пасля аварыі… Напэўна, не хапіла сіл.

Была позняя восень. Было слізка. Падмарожвала. Аліска ехала на сваёй старэнькай «дзевятцы» на працу. Неба было шэрае, халоднае і зусім няўсмешлівае, але яна не заўважыла – спяшалася. Дзень распланаваны літаральна па хвілінках – процьма працы і тузін перадвясельных клопатаў кшталту прымеркі сукенкі і выбару падарункаў родным будучага мужа. Сукенка была чырвоная. Незвычайна? Так, але прыгожа – чырвоная сукенка нарачонай на фоне чорных дрэваў, рэшткаў лістоты і шэра-сіняга неба. Неба восенню – колеру тугі…

Яна спяшалася. Дарога слізкая бы шкло. Толькі жоўтыя самотныя лісточкі напрыканцы лістапада спадаюць павольна – лунаюць… Аўтааварыі звычайна адбываюцца вельмі хутка. Пару хвілін. Машына перакулілася некалькі разоў. Пералом пазваночніка. Грудны аддзел. Валасы палымяна-рудыя, а вочы зялёныя. «Ён называў мяне сонейка…». Халаты – белыя.

Доктар падкрэслена-ветлівы.

– Вы засталіся жывая – вам пашанцавала.

– Я буду хадзіць?

– Вам пашанцавала – вы засталіся жывой…

– Сядзець у калясцы?

– Пасля курсу рэабілітацыі – так…

– Усё ў парадку: я бухгалтар па прафесіі, значыць, не прападу. Шкада, вяселле не адгулялі... Ну, а я і не люблю шумныя мерапрыемствы...

– Аліса, хадзіць ты не зможаш.

– Я ўсё адолею, доктар: у мяне ж ёсць Ромка!..

Было цяжка. Рукі не слухаліся. Думкі блыталіся. За вокнамі – зіма, і мроіўся на даляглядзе Новы год, водар сасны і мандарынаў. Як сустрэнеш яго – так і правядзеш... І сустрэла, і правяла новы год яна з бацькамі і сям'ёй брата, а потым менавіта яны (а яшчэ пляменніца Сашка) былі побач... Рэабілітацыя, падбор каляскі і праца дапамагалі не думаць пра чалавека, з якім (упэўнена ж была!) хацела пражыць усё жыццё, а ён не змог прыняць яе такой... Надламанай... Не мог зразумець – яна тая ж Аліса, толькі пасля краіны, дзе зусім не было цудаў.

* * *

Гулялі весела. Шмат гасцей, кветак, падарункаў і шыкоўная рэстарацыя ў цэнтры Менску. Нешта новае – Ірка ідзе замуж. Малодшая стрыечніца, малая!... Такая прыгожая ў белай сукенцы (міжволі падумала – калі выйду замуж, толькі белы колер, і жоўтыя дрэвы, і верасень!), і будучы муж сімпатычны хлопец.

Аліса ўжо не любіла чырвоны колер і апранула чорную сукенку-стрэйч. Псіхолагі сцвярджаюць, што чорны – колер незалежнасці... Чаму не? Незалежнасць – гэта супер. Знайсці б яшчэ незалежнасць ад хваробы і доўгіх самотных начэй – восеньскіх, шэрых, калі дажджы падобны да слёз!..

Музыка цудоўная, яны нават патанчылі з бацькам. Пасля некалькіх аперацый Аліса змагла хадзіць з канаткай, але часцей прыходзіцца карыстацца каляскай, таму што на сваіх нагах – гэта ў дзесяткі разоў больш павольна, чым на колах. Татка добра танчыць, а яны з мамай такая гожая пара!.. Госпадзі, зусім яшчэ маладыя...

Аліса глядзела на гасцей, а думала пра свой незведзены баланс (штосьці там не так, а што?)і пра тое, што ёй жудасна хочацца пабачыць марскі пейзаж... Балтыка. Чаму не? Апошнія тры гады шэф заваліў яе працай. Мм, даражэнькая, радуйся таму, што фірма развіваецца дынамічна і Дзмітры Іванавіч не выкінуў цябе на вуліцу пасля траўмы, пачакаў, пакуль ачуняеш. Харошы мужык наш шэф, але такога «працаголіка» яшчэ пашукаць... Музыка супер!

– Прывітанне! Давай патанцуем?

– Прывітанне… Я не вельмі добрая партнёрка, ты заўважыў?

– Ты маеш на ўвазе каляску? Але ж я бачыў, што ты можаш хадзіць, крыху. Давай паспрабуем!

«А хлопец сімпатычны і, здаецца, не батанік – утрымае… Рызыкнуць?».

– Мяне завуць Артур, давай рызыкнем!

– Давай, мяне – Аліса.

– Ведаю, разведка данесла!

Працягнуў ёй руку, дапамог устаць з каляскі і… Аліса адчула спакой і упэўненасць моцных мужчынскіх рук, «адчула» мелодыю, а музыкі, заўважыўшы незвычайную пару, паставілі запар дзве павольныя кампазіцыі. Аліса толькі цяпер заўважыла, што знаходзіцца далекавата ад каляскі і нават стамілася…

– Ты добры партнёр, я нават пра час забылася!

– Стамілася?

– Ёсць крыху…

– Я аднясу цябе, окей?

– Ну ужо не! На нас і так глядзяць больш, чым на маладых!

Артур не стаў больш спрачацца – проста падхапіў яе на рукі і панёс праз усю залу.

– Для цябе так важна, хто што скажа ці падумае?

– Ты не прраходзіў маёй «школы».

– У кожнага яна свая.

– Дзякуй табе.

– За што?

– А ты першы, хто асмеліўся запрасіць мяне вось так… на танец.

–Дурні. Ты не хочаш свежым паветрам дыхнуць? Тут занадта цёпла.

– Так, давай…

Мінаў жнівень. Стаяла спёка. І зоркі таксама былі. Іх запальваюць – і гэта камусьці патрэбна…

Пра што вы будзеце размаўляць з чалавекам, якога ведаеце дваццаць хвілін? Пра зоры, неба і лета? Кнігі, музыку? Сяброў і працу? Пра каханне? Зрэшты… Менавіта пра ўсё гэта і будзеце размаўляць, калі гэта ВАШ чалавек. Усё проста. Тэорыя роднасных душ.

Мінула некалькі дзён. Аліса дакапалася да галоўнай памылкі ў сваім балансе. Узяла адпачынак. І – на Балтыку. Лепшая сяброўка згадзілася паехаць разам, так што прыемная кампанія была забяспечана.

Год ці два пасля траўмы Аліса не любіла вадзіць аўто: цяжка было зноўку сесці за руль, цяжка сачыць за дарогай, але брат пераканаў, што трэба набыць новою машыну і вучыцца-вучыцца-вучыцца. Здорава ўсё ж мець старэйшага брата, падумала Аліса, едучы па дарогах (ужо!) Еўропы. Кастусь ведаў, што за жыццё трэба чапляцца зубамі, каб не страціць свой шанец... і заўжды даказваў гэта «малодшанькай». У дзяцінстве Аліска была той яшчэ гультайкай... Не любіла завязваць шнуркі ў пантофліках (і шмат чаго яшчэ не любіла!) і прымушала Кастуся рабіць гэта, ён спачатку трываў, а потым вырашыў, што малае канчаткова сядзе яму на карак і звесіць пульхныя ножкі, калі не змяніць кардынальна сітуацыю. Ён старанна паказваў, як справіцца са шнуркамі, калі ж Аліска адмаўлялася рабіць гэта сама, зачыняў дзверы кватэры і ішоў ганяць мяч у двары. Малая пыхцела, як цягнічок, плакала, а потым – навучылася. Не чакаць жа бацькоў з працы, каб пайсці пагуляць? Да таго ж, у кампаніі хлапчукоў ёй было цікавей.

Аксамітавы сезон. Сосны. Вецер. Бурштын. Пах солі і водарасцей. Два тыдні сапраўды еўрапейскага адпачынку. Прыморскія кавярні. Добрая кава. Жывая музыка. Шпацыр па марскім узбярэжжы. Вільня, Паланга, Тракай, Рыга, Юрмала... Шанец пакарыстацца размоўнай ангельскай. Сувеніры. Тэлефанаванні бацькам. І дзесьці, на краёчку свядомасці, з'яўляліся думкі пра Артура. Зрэдку.

* * *

Вярнаціся дадому – у залатую восень – і дома ўсё як раней, толькі пляменніца вывучыла некалькі новых слоў і крыху падрасла. Сашка хацела сустрэць Алісу (менавіта так – слова «цётка» ў іх лексіконе не было) і адразу ж атрымаць абяцаныя падарункі. Чаму нам заўжды здаецца, што дома назбіралася шмат навінаў, калі нас там няма? Вось пошты насамрэч – ладны стосік. Суседка прынесла газеты-часопісы-лісты і запэўніла, што спраўна палівала Аліскіны кактусы...

– Паліна, вы вырашылі зрабіць рамонт? Я ледзь прасунулася да сваёй кватэры, як выехала з ліфта – столькі там стройматэрыялаў...

– Ды не, гэта новы сусед актыўна даводзіць да ладу сваю кватэру.

– Зразумела... Пазнаёміліся ўжо?

– Так, яны з маім Андрэем некалькі разоў палілі разам на лесвічнай пляцоўцы... Сімпатычны хлопец! Ён доктар, хірург, здаецца... Ой, зусім забылася пра пліту! Адпачывай пакуль, распакоўвай рэчы, а я пазней зайду.

– Окей, я вам сувеніры прывезла.

– Дзякуй!

У душ і заснуць! Столькі гадзінаў за рулём – гэта вам не жартачкі... Еўропа – супер, вось бы яшчэ паменш на мяжы стаць...

Пабудзіў званок у дзверы. На гадзінніку – восем вечара. За вокнамі – амаль ноч, усё ж канец верасня. Аліса перасела на каляску, захінулася ў цёплы халацік і паімчала адчыняць дзверы. «Веееельмі цікава, хто з'явіўся, калі родзічаў папярэдзіла, што хачу паспаць?!». За дзвярыма ўсміхаўся Артур.

– Прывітанне. Пайшлі да мяне каву піць!

– Далёка?

– Не, мы ж з табой суседзі цяпер.

– І гэта выпадкова?

– Мм, у мяне было некалькі варыянтаў, але я выбраў гэты... Дарэчы, добры раён!

– А як жа... Кава ў цябе смачная?

– Такую экзатычную пакаштуеш толькі ў мяне!

Мінаў верасень. Яшчэ не было холадна. І зоркі былі. Калі іх запальваюць – гэта камусьці патрэбна. Гэта патрэбна ўсім нам. І зоркі, і неба, і... кава. Пра што вы будзеце размаўляць з чалавекам, якога бачыце другі раз у жыцці? Можна і памаўчаць. Вы ж знаёмыя тысячу гадоў. Усё проста. Тэорыя родных душаў.

*Восень, 2006*

# Вясновы джаз

Маладая жанчына сядзела на падваконні сёмага паверха і паліла... Русыя валасы авяваў ветрык. Неба зазірала ў вочы, а рукі дрыжэлі ад стомленасці.

Рэанімацыйная сястра. Дзяжурства сёння было насамрэч складаным. Ці выжыве дзяўчынка? Апошні шанец і так мала шансаў. Так мала, катастрафічна мала...

Кава – чорная, гарачая, з прысмакам дыму восеньскага вогнішча і чагосьці яшчэ – амаль забытага, не зразуметага да донца. Навушнікі, ў якіх гучыць джаз. Толькі яе джаз... Ды і не зразумее інтэрнатаўскі «кантынгент», маладзенькія дзяўчаты медсястрычкі, такую музыку, а тлумачыць простыя рэчы... Навошта? Каму гэта патрэбна? За акном – вясна... Гожая, харошая вясна. Пах пераменаў... Для яе вясна заўжды – з прысмакам новага. Хочацца паляцець, і так балюча – падаць. Стаіш на краёчку. Паляціш або разаб'ешся, разаб'ешся або паляціш. 50 на 50.

Альдона любіла Горад, але не любіла тлум і непатрэбныя зносіны. Яна знайшла «свае» мясціны, дзе ёй не перашкаджалі думаць і быць сабой. Такія, як старая кавярня, дзе можна было пачуць джаз... Выдаткоўвала грошы са свай не дужа вялікай зарплаты ды ехала на іншы канец горада. Адчуць. Убачыць. Зразумець. І не згубіцца канчаткова ў гэтым супярэчлівым свеце.

Макс граў на саксафоне. Яго ведалі. Яго чакалі. Усе ведалі, што ён – талент. Усе ведалі, што яго завуць Макс. А больш – нічога. Кожную другую пятніцу месяца ён з'яўляўся тут, каб здзіўляць і зачароўваць, зачароўваць і здзіўляць. Чорныя акуляры, чорны смокінг (а калі-некалі – пацёртыя джынсы ды цёплы світар) – і саксафон, які кожны раз гучаў па-рознаму. Спакойна, гарэзна, сэксуальна, хутка, павольна... Тысячы варыяцый.

І так атрымалася, што Альдона прыходзіла паслухаць менавіта яго саксафон. Спачатку спадабалася сама кавярня – ўтульная, з ноткай творчасці, якой так не хапала па жыцці. Музыка. А потым... З'явілася няўлоўная нітачка. Падалося – сустрэліся вачыма. Не гледзячы на яго чорныя акуляры. Выпадкова. Але адвесці вачэй яна ўжо не магла. Ад яго твару. Нервовых доўгіх пальцаў. Шырокіх, крыху сутулых плячэй. Непадатлівага вожыка шэрых валасоў.

Замаўляла дарагое віно. Слухала. Думала. Да яе нават не падыходзілі знаёміцца: усім было зразумела – гэта жанчына не

адна, яна кагосьці чакае. А яна насамрэч чакала. І спрабавала убачыць вочы за непранікальнымі акулярамі. Была ўпэўнена – блакітныя. Іскрыста-блакітныя. Абавязкова.

Быў яе вечар. Потым пачыналіся цяжкія панядзелкі. Стамляючая праца, якую вельмі любіла. І зносіны з чалавекам, якога даўно не любіла, але не магла сказаць «бывай!». Не магла, калі бачыла яго вочы – стомленыя да немагчымасці. Шэрыя... А калісьці такія вясёлыя, з чорцікамі-іскрынкамі. Калісьці і ён быў іншы. Малады таленавіты хірург. Наперадзе жыццё. Кар'ера... Зрэшты, гэта краіна і не такіх ламала. Там была сям'я. Тут – Альдона. А яшчэ шмат-шмат працы. Больш за ўсё на свеце ён любіў працу і... сына. Выбіраць недарэчы.

Быў звычайны красавіцкі вечар. Дождж накрапваў у стылі Дзюка Элінгтана. Альдона раптам успомніла... Пятніца.

Таксі. Дарога. Удых-выдых. Вырашыла. Сёння я падыду...

Макс граў джаз для Яе. Скурай адчуваў – для яе. Для жанчыны, якая сядзіць і п'е чырвонае віно. Пацёртыя джынсы і стомленыя вочы з іскрынкамі, што ён не можа ўбачыць. Адвечны чорны колер. І музыка.

Было або не?!
Проста сустрэліся вочы...
Было або не?!
Шлях самоту прарочыў...
Было або не?
Сутыкнуліся рукі...

Ім суджана стрэцца ў вясне.
Ім суджана крыху любові.
Ім суджана –
Глыток паветра і святла...

*20. 05. 2007.*

# Бумеранг

*Пашу, Зміцеру, Артуру і ўсім, усім, усім...*

Ніна Ясінская, высокапрафесійны юрыст і суддзя аднаго з раённых судоў Менска, не спяшалася дадому. Апошнім часам яна вярталася з працы бы пад прымусам. Гэта ўжо не быў ДОМ... Хутчэй, места адбыцця пакарання, зона, дзе не ведаеш, што з табой можа здарыцца праз пару хвілін. Па іроніі лёсу, у месцы не вельмі аддаленыя адпраўляла (або не адпраўляла) людзей менавіта яна сама...

Хто ж падпісаў прысуд жанчыне сарака год, у шэрых вачах якой з'явіўся страх, а іх вясёлыя іскрынкі зніклі ў чорных дзірках шэрых-шэрых думак? За паперамі можна праседзець хоць да ночы: менш іх не стане. Рана ці позна трэба вяртацца. Трэба хоць крыху адпачыць. Інакш заўтра проста не адолееш і элементарна-неабходных жыццёвых спраў. Душ. Гарбата. Чыстая пасцель. Кніга... Калі Антона няма дома або ён пад кайфам, задаволены сабой і сваімі думкамі. Калі ж не, ломка пачыналася і для Ніны. Божа, чаму ж яе хлопчык – адзіны сын – стаў такім? Гераін пазбавіў жанчыну надзеі на моцнае плячо і падтрымку. Напачатку яна нічога не разумела. Кампутар, цяжкая музыка, сябры, тусоўкі – звычайны сталічны тынэйджар... Так, яны практычна перасталі размаўляць як сябры. Гэта было раней (чым Ніна вельмі ганарылася, параўноўваючы Антошку з сынамі сяброўак) і гэтага раптам не стала. З'явілася адчужэнне. Іронія. Насцярожанасць. Падумала: «Нічога страшнага – пераходны ўзрост». Пройдзе. Ніна наогул была аптымістка: верыла ў сябе, сваю сям'ю, працу, у тое, што ўсё будзе окей...

Пайшоў муж. Здараюцца такія рэчы ў жыцці... Перажыла. Сын і кар'ера (як заўжды...). На гэту фішку была галоўная стаўка. Калі няма кахання, а асабістае жыццё зводзіцца да выпадковых курортных раманаў, жанчына (пры наяўнасці шэрага рэчыва ў галаве) абавязкова займецца кар'ерай – няма іншага выйсця. Ніна была вельмі разумнай жанчынай. Яна хутка зразумела, дзе трэба ісці да канца, а дзе адступіць за крок ад мэты. Кожная судовая справа патрабуе індывідуальнага падыходу. На пачатку яна імкнулася прытрымлівацца канстытуцыі і буквы закону, але... У шэрай краіне ці то на выспе пасярод балот, ці то ў цэнтры Еўропы, так часта змяняліся вышэйназваныя фундаментальныя рэчы... Бацькоўская кватэра ў цэнтры сталіцы выглядала значна лепш пасля еўрарэмонта, а кіраваць пежо слабой жанчыне лягчэй, чым заўжды праблемнай «дзевяткай». Жыццё карэктуе не толькі канстытуцыю, але і нашы прынцыпы. На штосьці Ніна заплюшч-

вала вочы, таму што так было патрэбна ёй, на штосьці вымушана была паглядзець пад іншым вуглом з-за пэўных тэлефанаванняў і сустрэч, але школа юрфака БДУ і комплекс былой выдатніцы не дазвалялі перайсці пэўную мяжу. Мяжу прафесіяналізму? Дакладнасці думак, слоў і папер – неадменна.

...Начны Менск быў прыгожы: сталінскі ампір губляў жорсткасць і холад логікі ў святле ліхтароў. Настрой горада рабіўся іншы, ноч сыпанула на вуліцы жменю чараў і... еўрапейскасці. Начны Менск яшчэ спадзяваўся на перамены, спадзяваўся ўспомніць сябе ранейшага. Знайсці сваё спрадвечнае аблічча...

Ніна ляцела па сталічных вуліцах, не спадзеючыся ні на што, але дарога супакойвала, надавала ўпэўненасці. Яна вытрымае – гэты горад(насамрэч – яе горад!) вытрымаў столькі ўсяго... Душа закамянела, стамілася, бы закутая Няміга, але ніхто не змог знішчыць яе дарэшты. У сонечных промнях, у вокнах старых дамкоў, у шчырых і светлых вачах дзетак – яна жыла – душа горада...

Паставіўшы машыну на стаянку, Ніна пачала падымацца па лесвіцы – не любіла ліфтаў і замкнёнай прасторы наогул. Прыступкі – прыступкі – прыступкі. Учора сын ударыў яе па твары. Не першы раз, але першы раз – так моцна. Страшныя, пустыя вочы. Не першы раз наркаману не хапіла на дозу... Некалькі курсаў лячэння тут і за мяжой. Некалькі год адчаю і спадзявання. Шкадавання. Сораму перад знаёмымі, калегамі, сябрамі... Нянавісці, што пераплецена з журбой. Прыступкі – думкі – прыступкі.

Дзверы адчынены. Рука на выключальніку. Кватэра была абсалютна пустой... Толькі шпалеры засталіся. Як ён паспеў так хутка вывезці ўсе рэчы?! Оргтэхніка, мэбля... Ніна не магла зразумець. І яшчэ яна не магла зразумець, як яе хлопчык стаў такім... Зрэшты, сын і яго сябры пакінулі раскіданыя па ўсім пакоям кнігі. Нічога больш. Яны заўжды любіла кнігі.

...А пытанне было – за што?! ...

Раптам успомніла сінія-сінія вочы таго хлопца. Разумныя і светлыя. Яму «далі» пяць год калоніі – Ніна падпісала вырак суду. Бацька-бізнэсмен быў непатрэбным канкурэнтам на алюмінеевым рынку – маскоўскі кілер прафесіўна выканаў сваю працу. Хлопчык зацікавіўся палітыкай – недарэчнае глупства.

Закон бумерангу пачаў дзейнічаць...

*Студзень'2007*

Дар’я Ліс

ВЯСНОВЫ JAZZ

# Змест

Прыміце яе, як наша сэрца... *Данута Бічэль* ....................3
Крыху пра сябе... ..................................................................9

## Вершы

Беларусь – краіна незвычайная.......................................10
Краіна-загадка....................................................................11
І зоры, і вечар –..................................................................12
Апала лістота, ....................................................................13
Я балансую на мяжы ........................................................14
Кампрамат..........................................................................15
Восень. ...............................................................................16
Сустрэцца аднойчы -.........................................................17
Ты прабач ...........................................................................18
Не сустрэцца... ...................................................................19
Ты палі… .............................................................................20
Адліга пасярод зімы...........................................................21
Каляды ...............................................................................22
Краіна манкуртаў – ...........................................................23
Мы па-за законам ..............................................................24
Знікаюць людзі – ...............................................................25
Падалі хмарачосы - ............................................................26

www.kamunikat.org

У радасці, журбе - ........................................................ 27
Менск падобны на Лондан – .......................................... 28
Мая восень ..................................................................... 29
Кастрычнік. ..................................................................... 30
Я не шкадую ................................................................... 31
Між намі – цунамі, ........................................................... 32
На Беларусі восень, ....................................................... 33
ПАЗЛ ............................................................................... 34

## Апавяданні

Пад Новы год... ............................................................. 36
Звычайная гісторыя ....................................................... 38
Лістота напрыканцы лістапада ападае павольна... ........ 45
Вясновы джаз ................................................................ 50
Бумеранг ........................................................................ 52

www.kamunikat.org

